**П. Лабкоўская**

# СЕМІЯТЫЧНАЯ ПРАСТОРА Ў ТВОРАХ МАСТАКА АЛЕСЯ РОДЗІНА

Неабходна ведаць і памятаць людзей, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё беларускай культуры. Адным з такіх выбітных, таленавітых і цікавых творцаў можна назваць мастака Алеся Родзіна (1947–2022), які нарадзіўся ў горадзе Баранавічы.

Алесь Родзін займаўся манументальным жывапісам. Ён лічыўся мастаком старэйшага пакалення, знаходзіўся ў авангардзе сучаснага беларускага мастацтва. Мэта артыкула – вызначыць семіятычную прастору творчасці Алеся Родзіна ў развіцці мастацкай культуры Беларусі ІІ пал. XX – пач. XXI ст.

Алесь Родзін пачаў вучыцца у мастацкай студыі В. Вярсоцкага і ў мастацкай школе № 1 г. Мінска. Паступіў у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, дзе сярод яго педагогаў былі І. Ахрэмчык, Н. Воранаў, Х. Ліўшыц. Кансерватызм мастацкага асяроддзя часу навучання сфарміраваў уласнае светаадчуванне. Ён падштурхнуў мастака да «андэграўндных пошукаў першай хвалі». Так назвалі пазней плыню творцаў 1970-х гг. Мастак знайшоў уласны адметны метад, які пазней мастацтвазнаўца Яўген Шунейка назваў «нон-стоп-панарама».

Першая персанальная выстава адбылася ў 1971 годзе. Працяглы час Алесь Родзін жыў у Берліне – у вядомай творчай прасторы «Тахелес». Апошнія гады жыцця Родзін жыў на Беларусі і з паплечнікамі ладзіў фестываль эксперыментальнага мастацтва «Дах», цікавіўся беларускай гісторыяй.

Алесь Родзін лічыў, што ў кожнай рабоце павінна прысутнічаць глыбіня, якая ўплывае на гледачоў, незалежна ад таго, які ў іх узровень адукацыі, паходжанне.

У карціне «Міфалагема тысячагоддзя» адлюстравана супярэчлівасць нашага свету з найскладанейшымі асновамі: рэлігія, філасофія, творчасць і сэнс жыцця. Сам мастак пра гэту работу казаў, што яна ўяўляе свет сучаснай цывілізацыі з яе сумбурам і калейдаскопам катаклізмаў. Нараджэнне, смерць, навука, вайна, каханне – усё змешчана на адзіным палатне.

Карціна «Сэрца» пра каханне, растанне, палігамію жыцця. Усё б’ецца ў адзіным рытме і застаецца ў сэрцы.

Карціна «Карані» нагадвае скарб, захаваны ў беларускай зямлі, дзе можна ўбачыць гістарычныя падзеі, мастакоў, навукоўцаў, звычайных людзей. Калі нашчадкі будуць памятаць, шанаваць карані, то і дрэва жыцця працягне існаванне.

Вобраз дзіцяці ў карціне «Лёс» адкрывае новы погляд на жыццё чалавека, які толькі нарадзіўся і ўпершыню глядзіць са здзіўленнем на свет, напоўнены фарбамі. Карціна паказвае погляд на дарослы свет, які звыкся з рэчаіснасцю і развучыўся пільна ўглядацца ў яго.

Як зазначыў сам мастак Алесь Родзін: «Мастацтва – гэта мова, праз якую можна размаўляць з людзьмі». Сусвет яго работ значна паўплываў на стан сучаснага беларускага мастацтва, які аб’яднаў мастакоў-аднадумцаў і заняў ганаровае месца сярод прадстаўнікоў сучаснага беларускага жывапісу.